# Распараджэнне
# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

4 ліпеня 2017 г. № 109рп г.Мінск

Аб зацвярджэнні рашэння савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва

1. Зацвердзіць прыкладзенае рашэнне савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.

2. Міністэрству культуры выдзеліць у 2017 годзе са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва 369 834 рублі на ажыццяўленне выплат у адпаведнасці з рашэннем, указаным у пункце 1 дадзенага распараджэння.

3. Кантроль за мэтавым выкарыстаннем сродкаў, выдзеленых згодна з пунктам 2 дадзенага распараджэння, ускласці на Камітэт дзяржаўнага кантролю і Міністэрства культуры.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ * 1 *
Для правовых актов

10

ЗАЦВЕРДЖАНА

Распараджэнне Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
04.07.2017 № 109рп

РАШЭННЕ

савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
па падтрымцы культуры і мастацтва

4 красавіка 2017 г. пратакол № 3 г.Мінск

Выдзеліць:

за кошт адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурныя каштоўнасці або зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; кампенсацый за шкоду, прычыненую гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; дабрачынных узносаў грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, а таксама юрыдычных асоб у выглядзе грашовых сродкаў і матэрыяльных каштоўнасцей; іншых паступленняў у адпаведнасці з заканадаўствам на спецыяльны пазабюджэтны рахунак Міністэрства культуры Гродзенскаму аблвыканкаму на капітальны рамонт гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі ”0“ ”Барысаглебская (Каложская) царква XII стагоддзя ў г.Гродна“ 200 000 рублёў;

за кошт асігнаванняў з рэспубліканскага бюджэту:

Гродзенскаму аблвыканкаму на кансервацыю Княжацкай вежы гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі ”2“ ”Фрагменты замка XIV стагоддзя ў в.Крэва Смаргонскага раёна“ 105 800 рублёў;

навукова-даследчай і асветнай установе культуры ”Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік“ на рэстаўрацыю шляхам таніравання адслоенага жывапісу XVIII – XIX стагоддзяў у гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі ”0“ ”Спаса-Праабражэнская царква ў г.Полацку“ 64 034 рублі.

Старшыня савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва Н.У.Шарубіна